**Каханоўскі Аляксандр Генадзьевіч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (Мінск, Беларусь)*

# САЦЫЯЛЬНАЯ ДЫНАМІКА БЕЛАРУСКАГА ГРАМАДСТВА НАПЯРЭДАДНІ РЭВАЛЮЦЫЙНЫХ ПАДЗЕЙ 1917 Г.

Бурны час пачатку XX ст. у Беларусі вызначаўся ўздымам нацыянальна-культурнага руху, пашырэннем нацыянальнай свядомасці беларускага народа, актывізацыяй грамадскага жыцця, нарастаннем пратэсных настрояў, рэвалюцыйнымі падзеямі 1905—1907 гг. Апошнія пакінулі свой заўважны уплыў нават, калі адбылася стабілізацыя палітычнага рэжыму ў Расійскай імперыі ў 1907—1914 гг., непараўнальна ўзмацніўся ўрадавы ціск на грамадскія настроі, на дзейнасць палітычных партый і грамадскіх арганізацый, пашырыліся апатычныя настроі сярод многіх з іх у бачанні перспектыў сацыяльных пераўтварэнняў, здзяйсненні рэвалюцыйных планаў. Палітычны ціск на грамадства і рэпрэсіі ў дачыненні да рэвалюцыйных партый супалі з імклівым эканамічным уздымам, пэўным ростам матэрыяльнага дабрабыту насельніцтва. Апошняе стала адным з фактараў, што нават сярод сацыяльна актыўных наёмных работнікаў на першы план выйшлі эканамічныя патрабаванні, жаданне атрымаць сацыяльныя гарантыі.

Рэвалюцыя 1905—1907 гг. надала новы імпульс сацыяльным працэсам, пакінула адчувальны след у свядомасці шырокіх слаёў насельніцтва, выклікала змены ў дзяржаўна-палітычным уладкаванні Расійскай імперыі. Нягледзячы на абмежаванасць, былі ўведзены дэмакратычныя правы і свабоды, з'явіўся вопыт парламенцкай дзейнасці і палітычнай арганізацыі. Непасрэдным вынікам рэвалюцыйнай дзейнасці рабочых стала павелічэнне іх заработнай платы, скарачэнне працоўнага дня, зніжэнне штрафаў і ў канечным выніку з'яўленне сацыяльнага страхавання работнікаў. Былі легалізаваны прафсаюзы. Яшчэ ў 1903 г. была ўведзена рэгламентацыя адказнасці прадпрымальнікаў за няшчасныя выпадкі з рабочымі падчас працы. Пацярпелым ці членам іх сямей павінна была выплачвацца грашовая дапамога ў залежнасці ад ступені страты працаздольнасці [12, с. 596—603]. Наступным крокам у сферы страхавання рабочых стала прыняцце 23 чэрвеня 1912 г. пакета законаў аб забеспячэнні рабочых у сувязі з няшчаснымі выпадкамі і па хваробе [9, с. 855—868; 10, с. 847—850; 11, с. 850—855; 8, с. 868—882]. Грашовыя дапамогі і пенсіі па прычыне няшчасных выпадкаў выплачваліся па новым законе страхавымі таварыствамі, у склад якіх абавязкова ўваходзілі ўладальнікі прадпрыемстваў. Выплаты па хваробе здзяйсняліся бальнічнымі касамі, членамі якіх былі рабочыя і служачыя. Прадпрымальнікі павінны былі забяспечыць першую ўрачэбную дапамогу, аплаціць лячэнне. Уздым рабочага руху ў перыяд рэвалюцыі 1905—1907 г. прымусіла ўрадавыя органы больш дзейсна клапаціцца і аб бытавых умовах працы і жыцця наёмных работнікаў. У прыватнасці, у цыркуляры Міністэрства фінансаў ад 22 лютага 1905 г. прапаноўвалася «вызначыць тыя мясцовыя меры, якія прамыслоўцы маглі б і згодны былі б прыняць супольна, тэрмінова для заспакаення разважлівай часткі рабочых у сэнсе магчымага паляпшэння іх быту» [16, л. 39].

Урад вымушаны быў пайсці па шляху рэфармавання вёскі, былі адменены некаторыя саслоўныя абмежаванні для сялянства. Уплыў рэвалюцыі закрануў

і сацыяльна-культурную сферу, пашырыліся магчымасці камунікацыі, больш даступнымі і запатрабаванымі сталі здабыткі культуры для насельніцтва. У паслярэвалюцыйныя гады ў Беларусі, нягледзячы на неспрыяльныя ўмовы і абмежаванні для развіцця беларускай нацыянальнай культуры, імкліва расла колькасць школ, перыядычных выданняў, бібліятэк, з'явіўся кінематограф і інш.

Гады паміж рэвалюцыяй 1905—1907 гг. і Першай сусветнай вайной сталі часам імклівых перамен у сацыяльна-эканамічным развіцці Беларусі. Завяршэнне да пачатку XX ст. прамыслова-тэхнічнага перавароту знайшло працяг у далейшай тэхнічнай мадэрнізацыі фабрычна-заводскай вытворчасці. Адбываўся рост энергаўзбраення ва ўсіх галінах прамысловасці праз выкарыстанне паравых, электрычных рухавікоў, рухавікоў унутранага згарання. За 1908—1913 гг. на 27,2% у Беларусі павялічылася колькасць буйных (цэнзавых) прадпрыемстваў, аб'ём вытворчасці на іх за гэты час вырас на 67,5%. Паралельна імпульс да росту выявіла і дробная вытворчасць, якая арыентавалася, перш за ўсё, на мясцовага спажыўца і звязана галоўным чынам са сферай абслугоўвання і вырабам тавараў масавага спажывання. Пасля прамысловага крызісу пачатку XX ст. выразна прасочваецца тэндэнцыя пашырэння перапрацоўкі сыравіны, якая раней пастаўлялася на продаж у неапрацаваным выглядзе, актывізавалася развіццё дрэваапрацоўкі [1, с. 36]. З 1910 г. пачаўся інтэнсіўны пад'ём прамысловай вытворчасці Беларусі, калі прырост аб'ёму вырабляемай прадукцыі быў у 1,9 разы вышэй, чым за папярэдні васьмігадовы перыяд. У 1908—1913 гг. сярэднегадавы прырост прамысловай вытворчасці Беларусі складаў каля 14%. Нягледзячы на імклівы эканамічны рост, удзельная вага прамысловай вытворчасці беларускіх і літоўскіх губерняў у агульнай суме прамысловай вытворчасці Расійскай імперыі за 1908—1912 гг. зменшылася з 1,9 да 1,7% [3, с. 85].

Агульная колькасць пастаянных наёмных работнікаў у Беларусі напярэдадні Першай сусветнай вайны складала 519 тыс., у тым ліку 55 тыс. рабочых, занятых у фабрычна-заводскай прамысловасці, 94 тыс. — на дробных прамысловых прадпрыемствах і ў саматужна-рамесніцкай вытворчасці, 40 тыс. — на чыгуначным транспарце, 200 тыс. — у сельскай гаспадарцы, каля 86 тыс. будаўнікоў, чорнарабочых, рабочых лесанарыхтовак, 44 тыс. наёмных работнікаў у сферах гандлю, сувязі, камунальнага і бытавога абслугоўвання [6, с. 157]. Рабочыя складалі ў 1913 г. каля 5,6% насельніцтва Беларусі, па Расійскай імперыі — 8,8%. Удзельная вага наёмных работнікаў Беларусі ў складзе расійскага пралетарыяту была дастаткова невысокай — 2,7%. Нават сельскагаспадарчы пралетарыят Беларусі меў невысокі паказчык удзельнай вагі сярод аналагічнай групы расійскіх рабочых — 3,2%. Структура рабочага класа Беларусі мела заўважныя адрозненні ад яго структуры па Расійскай імперыі, перш за ўсё, вызначалася меншай удзельнай вагой фабрычна-заводскіх рабочых сярод наёмных работнікаў і ў агульнай масе насельніцтва. Апошні колькасны паказчык па Беларусі складаў каля 0,6%, па Расійскай імперыі — 2,0%. Канцэнтрацыя рабочых на прамысловых прадпрыемствах у Беларусі была заўважна ніжэй, чым сярэднія паказчыкі па Расійскай імперыі, што было абумоўлена асаблівасцямі галіновай структуры гаспадаркі Беларусі.

Беларусь у пачатку XX ст. заставалася аграрным рэгіёнам Расійскай імперыі, нягледзячы на поспехі ў развіцці прамысловасці. Каля 80% даходу

прыносіла сельская гаспадарка. У 1907—1914 гг. сельская гаспадарка, перш за ўсё, сяляне Беларусі ў сваёй гаспадарчай дзейнасці пераважна сутыкаліся з тымі ж праблемамі, што і раней. Аднак адчувальнымі сталі і перамены. Перш за ўсё, агранамічная і тэхнічная дапамога з боку земскіх і ўрадавых устаноў, якая істотна павялічылася ў выніку правядзення сталыпінскай аграрнай рэформы, станоўча паўплывалі на культуру земляробства і жывёлагадоўлі. Актывізавалася роля Сялянскага пазямельнага банка. У 1907—1909 гг. ён выдаў сялянам беларускіх губерняў 5148 пазык, з дапамогай якіх былі набыты 183 310 дзес. зямлі. У 1910—1912 г. колькасць пазык ужо павялічылася да 13 394, а набытых зямельных угоддзяў — да 313 549 дзес. Беларускія губерні адносіліся да ліку тых рэгіёнаў Расійскай імперыі, дзе ад самага пачатку рэалізацыі рэформы землеўпарадкавальныя мерапрыемствы адбываліся паскоранымі тэмпамі.

Сталыпінская аграрная рэформа, якая значна паглыбіла дух прадпрымальніцтва ў вёсцы, прымусіла землеўласнікаў пераўладкоўваць свае гаспадаркі з улікам зменлівай рыначнай кан'юнктуры. Аднак многія з іх не адчувалі магчымасці ці неабходнасці праводзіць рэарганізацыю сваіх маёнткаў на гандлёва-прамысловых пачатках, што павялічвала іх запазычанасць, неканкурэнтаздольнасць і паскарала ліквідацыю зямельных уладанняў. У 1905—1910 гг. аб'ёмы продажу зямельных угоддзяў у беларускіх губернях павялічыліся на 77,3 %. За гэты час аб'ёмы дваранскага саслоўнага землеўладання скараціліся на 7,2 %. Асабліва працэсы мабілізацыі землеўладання паскорыліся ў 1911—1914 гг.

На пачатковым этапе станаўлення буржуазных адносін панаваў аднабаковы рух прадуктаў і паслуг з сельскай мясцовасці ў гарады. У пачатку XX ст. значныя аб'ёмы набыло спажыванне прамысловых вырабаў у вёсцы, больш адчувальным стаў уплыў элементаў гарадской культуры на традыцыйны быт беларускай вёскі. Гэты працэс меў рэгіянальныя асаблівасці. У найменшай ступені ён праявіў сябе ў тых мясцовасцях, якія былі больш аддаленыя ад гарадоў і буйных мястэчак. Уцягнутасцю ў дадзены працэс вылучаліся заходнія і паўночна-заходнія раёны Беларусі. Відавочная перавага прылад і рэчаў хатняга ўжытку фабрычнай вытворчасці перад вырабамі вясковых майстроў змяняла стаўленне сялянства, асабліва моладзі, да гарадской цывілізацыі. У канцы XIX — пачатку XX ст. павялічылася колькасць шматвулічных вёсак, палепшыліся канструкцыя і інтэр'ер сялянскіх хат, з'явіліся мураваныя падмуркі, зашклёныя вокны, гонтавы дах, выцясняліся курныя хаты «белымі» з комінам і інш. Якасць жылля вызначалася матэрыяльным дабрабытам сельскага жыхара [4, с. 527]. Адносіны сялянства Беларусі былі непрымальнымі да ўраўняльнага прынцыпу размеркавання зямлі, і ў той жа час прысутнічала стаўленне часам негатыўнае да заможных аднавяскоўцаў. Традыцыйныя культура, нормы паводзін, светаўспрыяцце сялян усё ж былі вельмі трывалымі. Старыя традыцыі не знікалі, а адбывалася іх своеасаблівае пераасэнсаванне.

На мяжы XIX і асабліва ў пачатку XX ст. заўважнай становіцца тэндэнцыя вызначэння сацыяльнага статусу і ролі асобы праз механізмы дасягнення, якія закранулі сацыяльна-прафесійную дзейнасць. Гэта ў найбольшай ступені датычылася адукаванай і эканамічна актыўнай часткі грамадства. На мяжы XIX—XX ст. высокую запатрабаванасць адукацыя атрымала

сярод сялянства. Авалоданне адукацыяй уплывала на паводзіны людзей, садзейнічала іх рацыяналізацыі, арыентацыі на дасягненне максімальнага выніку. Пісьменнік Л. Гмырак адзначаў: «Патрэбу і карысць асветы ў нашай вёсцы цяпер людзі пачынаюць разумець. Даўней, калі загаварыць аб гэтым з селянінам найчасцей пачуеш, што гэта ўсё пустое, што араць патрапіць і неграматны і, адным словам, нятрэба пасылаць дзяцей у школу, а цяпер ужо не. Гэткай гаворкі неяк саўсім не чутно, бадай кожны кажа, што грамату ведаць трэба, што неграматнаму надта цяжка жыць на свеце» [5, с. 1]. У газеце «Минский листок» 25 лютага 1892 г. паведамлялася: «Уварванне індывідуалізму ў сялянскую сям’ю, усе члены якой яшчэ нядаўна складалі адзінае цэлае, якое дэспатычна кіравалася старэйшым членам, робіць вялікія поспехі. Сямейныя раздзелы цяпер ужо звычайная з’ява і рэдка можна сустрэць сям’ю, якая трымаецца дзедаўскіх запаветаў» [2, с. 188—189]. С. Каваль з Горацкага павета ў сваёй карэспандэнцыі, апублікаванай ў кастрычніку 1911 г. на старонках «Нашай нівы», вельмі спачувальна адгукнуўся аб ранейшых традыцыях вялікай беларускай сям’і: «Калісь сяляне жылі вялікімі сем’ямі, ня дзелячыся. Старшым лічыўся бацька. Ён ведаў парадак... Цяпер ні так! Ажаніў бацька сына дык і аддзеляй; другога ажаніў — і яго аддзеляй. Пры дзяльбе сваркі ды бойкі» [15, с. 558—559]. У канцы XIX ст. пераважала ўжо малая, нуклеарная сям’я. Сямейныя раздзелы дазваляліся адпаведна пісьмоваму прыгавору сельскай грамады, але большай часткай яны адбываліся самавольна.

Узровень злачыннасці выступае ў якасці аднаго з выразных паказчыкаў стану грамадства. У традыцыйным грамадстве, калі насельніцтва менш мабільнае і прысутнічае больш дзейсны сацыяльны кантроль з боку грамады, звычайна назіраецца невысокая ступень злачыннасці. І наадварот, у індустрыяльным грамадстве, у якім насельніцтва сацыяльна і геаграфічна больш мабільнае, прысутнічае, як правіла, больш высокі ўзровень злачыннасці. Аднак найбольшых памераў яна дасягае ў грамадствах, якія праходзяць стадыю сур’ёзнай трансфармацыі сацыяльных інстытутаў, культурных і палітычных каштоўнасцей [7, с. 78—79]. Па стане на 1912 г. у Віленскай губерні на 100 тыс. насельніцтва налічвалася 114 асуджаных агульнымі і міравымі судамі, у Віцебскай — 101, у Мінскай — 80, Гродзенскай — 74, Магілёўскай — 67. У беларускіх губернях асуджаных было менш, чым у Пецярбургскай (355 асуджаных на 100 тыс. насельніцтва), Эстляндскай (307) губернях і Амурскай вобласці (304), якія па ўзроўню злачыннасці займалі лідзіруючыя пазіцыі ў Расійскай імперыі [13, с. 398—399].

Пры перанаселенасці Беларусі, адносна невялікім попыце мясцовай прамысловасці на працоўную сілу канкурэнцыя паміж наёмнымі работнікамі за работу, барацьба за кавалак хлеба стваралася дастаткова напружаная. Акрамя таго, у Беларусі пераважалі старыя формы прамысловай вытворчасці, дзе прысутнічаў паніжаны ўзровень аплаты працы. Паводле меркавання П. Рындзюнскага, памеры паўперызацыі насельніцтва большасці заходніх губерняў не былі збалансаваны з запатрабаванасцю ў рабочай сіле мясцовай прамысловасці [14, с. 51]. Становішча рабочых было розным, у залежнасці ад характару вытворчасці, велічыні прадпрыемства.

Беларусы вызначаліся ў еўрапейскай частцы Расійскай імперыі найбольшай удзельнай вагой тых, хто быў заняты ў сельскай гаспадарцы,

і мінімальнай — у прамысловасці. Аднак працэс станаўлення буржуазнага грамадства ў Беларусі значна ўскладняўся этнаканфесійнымі і саслоўнымі адрозненнямі розных груп насельніцтва, абмежавальнымі мерапрыемствамі ўрада. Рабочы клас, які дынамічна рос, складаўся ў значнай ступені з сялян, якія не парывалі свае сувязі з вёскай. Спадчынных рабочых было вельмі мала. Фабрычна-заводскі пралетарыят меў невысокую ўдзельную вагу сярод насельніцтва. У другой палове XIX — пачатку XX ст. у Беларусі паступова складваецца новая сацыяльная група прадпрымальнікаў. Аднак дадзены працэс стрымлівала спецыфічная структура мясцовага эканамічнага жыцця, раз'яднанасць вытворчасцей і капіталаў па дробных прадпрыемствах.

### Бібліяграфічны спіс

1. Абезгауз, З. Е. Рабочий класс Белоруссии в начале XX в. (1900—1913 гг.) / З. Е. Абезгауз. — Минск: Наука и техника, 1977. — 168 с.

2. Белоруссия в эпоху капитализма: сб. док. и материалов: [в 3 т.] / Гл. арх. упр. при Совете Министров БССР, Ин-т истории Акад. наук БССР. — Минск: Наука и техника, 1983—1990. — Т. 1: Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии / сост.: В. И. Мелешко [и др.]; ред.: К. И. Шабуня, В. Н. Жигалов. — 1983. — 272 с.

3. Бовыкин, В. И. Финансовый капитал в России накануне Первой мировой войны / В. И. Бовыкин. — М.: РОССПЭН, 2001. — 320 с.

4. Гісторыя сялянства Беларусі: са старажытных часоў да 1996 г.: у 3 т. / рэдкал.: М. С. Сташкевіч [і інш.]. — Мінск: Беларус. навука, 1997—2002. — Т. 2: Ад рэформы 1861 г. да сакавіка 1917 г. / З. Е. Абезгауз [і інш.]; пад рэд. В. П. Панюціча. — 2002. — 552 с.

5. Гмырак, Л. Якой нам трэба школы / Л. Гмырак // Наша Ніва: першая беларус. газ. з рыс. — Факс. выд., 1912—1915, 1920. — [Мінск, 2009]. — Вып. 5. — 1913. — 19 верас. — С. 1.

6. История рабочего класса Белорусской ССР: в 4 т. / гл. редкол.: П. Т. Петриков (пред.) [и др.]. — Минск: Наука и техника, 1984—1987. — Т. 1: Рабочий класс Белоруссии в период капитализма / редкол. т.: К. И. Шабуня (отв. ред.), М. О. Бич, Ю. И. Кирьянов. — 1984. — 400 с.

7. Миронов, Б. Н. Социальная история России периода империи, XVIII–начало XX в.: генезис личности, демократической семьи, гражданского общества и правового государства: в 2 т. / Б. Н. Миронов. — СПб.: Дмитрий Буланин, 1999. — Т. 2. — 567 с.

8. О страховании рабочих от несчастных случаев: Закон, 23 июня 1912 г., № 37447 // Полное собрание законов Российской империи. Собрание 3: в 33 т. — Петроград, 1915. — Т. 32: 1912, отд-ние 1. — С. 868—882.

9. Об обеспечении рабочих на случай болезни: Закон, 23 июня 1912 г., № 37446 // Полное собрание законов Российской империи. Собрание 3: в 33 т. — Петроград, 1915. — Т. 32: 1912, отд-ние 1. — С. 855—868.

10. Об учреждении присутствий по делам страхования рабочих: Закон, 23 июня 1912 г., № 37444 // Полное собрание законов Российской империи. Собрание 3: в 33 т. — Петроград, 1915. — Т. 32: 1912, отд-ние 1. — С. 847—850.

11. Об учреждении совета по делам страхования рабочих: Закон, 23 июня 1912 г., № 37445 // Полное собрание законов Российской империи. Собрание 3: в 33 т. — Петроград, 1915. — Т. 32: 1912, отд-ние 1. — С. 850—855.

12. Правила о вознаграждении потерпевших вследствие несчастных случаев рабочих и служащих, а равно членов их семейств, в предприятиях фабричнозаводской, горной и горнозаводской промышленности: мнение Гос. Совета, 2 июня 1903 г., № 23060 // Полное собрание законов Российской империи. Собрание 3: в 33 т. — СПб., 1905. — Т. 23: 1903, отд-ние 1. — С. 595—606.

13. Россия, 1913 г.: стат. — док. справ. / Рос. акад. наук, Ин-т рос. истории; ред. — сост.: А. М. Анфимов, А. П. Корелин. — СПб.: Рус. — Балт. информ. центр «Блиц», 1995. — 416 с.

14. Рындзюнский, П. Г. Крестьяне и город в капиталистической России во второй половине XIX века: взаимоотношение города и деревни в социально-экономическом строе России / П. Г. Рындзюнский; Акад. наук СССР, Ин-т истории СССР. — М.: Наука, 1983. — 270 с.

15. Саўка Каваль. С. Хоміно / Саўка Каваль // Наша Ніва: першая беларус. газ. з рыс. — Факс. выд. — [Мінск, 2003]. — Вып. 4: 1911. — С. 558—559.

16. Циркуляры отдела промышленности Министерства финансов и Министерства торговли и промышленности и Главного по фабричным и горнозаводским делам присутствия // НГАБ. — Фонд 310. — Воп. 1. — Спр. 7.

**Лойко Лариса Егоровна**

*Академия МВД Республики Беларусь (Минск, Беларусь)*

## ФЕНОМЕН РЕВОЛЮЦИИ В ИСТОРИИ ГОРОДА: НА ПРИМЕРЕ МОГИЛЕВА

После Петрограда и Москвы Могилев был третьим городом Российской империи, в котором решалась судьба революции 1917 года. В городе находилась Ставка Верховного главнокомандующего. Шла первая мировая война, поэтому российский император посчитал расположение Могилева наиболее удачным с точки зрения безопасного расположения от линии фронта и одновременно наиболее близкого для руководства войсками. В Могилеве много времени проводила семья российского императора Николая II. Повседневные аспекты жизни императорской семьи в Могилеве изложены в оригинальной работе М. Белевской [1].

В Могилеве постоянно проживал наследник, царевич Алексей. Супруга императора и дочери часто уезжали в Петербург. Жителям Могилева Александра Федоровна не понравилась с первого приезда. Она произвела впечатление «злой и надменной женщины». Останавливалась и жила императрица чаще всего в специальном вагоне, на вокзале. В ее свите в Могилеве бывал поэт Сергей Есенин. Дочери Николая II понравились жителям Могилева. Девушки свободно, без охраны, гуляли по городу, заходили в лавки, делали покупки. Излюбленным местом в городе у них был галантерейный магазин Бернштейна. Интенсивно в городскую жизнь был включен царевич Алексей.

Продовольственное и промышленное обеспечение Могилева было значительно лучшим, чем в других городах империи, поэтому Николай II был крайне удивлен докладом М. Родзянко о предреволюционной ситуации в государстве. Волнения в Петрограде 22—25 февраля, во время которых народ требовал хлеба, не повлекли за собой реакции императора. Несмотря на тревожные сообщения из северной столицы, он оставался спокоен. 28 февраля Николай II выехал в Петроград, но скоро вернулся в Могилев.

6 марта в Могилев пришла телеграмма Временного правительства с разрешением царской семье выехать за границу. На следующий день было принято решение об аресте самодержца и препровождении его в Царское